Ажывіць гісторыю

# АВАНТУРЫ Ў ПОЎНЫМ МЕТРЫ

**Танк па чарцяжах Леанарда да Вінчы, палацавыя інтэр'еры і маляўнічыя краявіды, прыгоды і пагоні, інтрыгі і рамантыка, вернасць і здрада, — фрагменты вялізнага кінапалатна, якія густа замешаныя на айчыннай гісторыі і суправаджаюцца пазнакай «12 плюс». У апошнія дні зімы Выдавецкі дом «Звязда» прадставіў у Мінску трэйлер нацыянальнага кінапраекта «Авантуры Пранціша Вырвіча», прэм'ера якога адбудзецца ў сярэдзіне сакавіка, а здымачная група прыадкрыла падрабязнасці стварэння кінастужкі.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Мне вельмі хацелася «пажыць» у XVIII стагоддзі, у тую эпоху плашча і кінжалу, напэўна, найменш вербалізаваную з усёй нашай гісторыі, нягледзячы на падзейную разнастайнасць і насычанасць, — тлумачыць сваю цікавасць да тэмы **пісьменніца Людміла РУБЛЕЎСКАЯ**, паводле кнігі якой і створаны фільм. — Можа быць, падагрэла мой інтарэс і выданне Адама Мальдзіса «Беларусь у люстэрку мемарыяльнай літаратуры XVIII стагоддзя» пра жыццё нашых продкаў, і мае ўласныя знаходкі, зробленыя падчас работы над дакументальнымі артыкуламі па гісторыі беларускай літаратуры. Я пабачыла, які гэта невераґодны матэрыял, колькі ўсяго цікавага адбывалася ў гэты перыяд у Беларусі, чаго ў нас, здавалася, і быць не магло!»

Пісьменніца планавала стварыць «вясёлую аповесць» з удзелам двух персанажаў, якія ўвасобілі розныя бакі «беларуса гістарычнага» і разбурылі пэўныя стэрэатыпы (адзін — збяднелы шляхцюк Пранціш Вырвіч, які ў любых умовах захоўвае гонар і высакароднасць, другі — сын простага полацкага рамесніка Баўтрамей Лёднік, які зрабіў сябе сам, спасціг мудрагелістыя навукі і наогул шмат у чым нагадвае Францыска Скарыну). Але гісторыя зацягнула аўтара, героі сталі жыць паўнавартасна (інтэлектуал Баўтрамей Лёднік, напрыклад, памаладзеў і з другаснага персанажа ператварыўся ў адну з галоўных дзеючых асоб) і дыктаваць свае ўмовы, шукаць скарбы, даследаваць інтрыгі; у выніку аповесць ператварылася ў раман, затым другі... На сёння ў серыі пра авантуры Пранціша Вырвіча ўжо выйшла пяць кніг.

Першая з іх і лягла ў аснову сцэнарыя, які па замове міністэрства культуры напісаў для гісторыка-прыгодніцкага фільма Валянцін Залужны. Больш за год на нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» ішлі здымкі, за працэсам якіх пільна сачылі чытачы і патэнцыйныя гледачы карціны. Стваральнікі фільма перакананыя: нягледзячы на лёгкі жанр, а мо, нават дзякуючы яму, стужка абяцае стаць значнай кінаработай, якая прыцягне да беларускай гісторыі нават далёкіх ад яе людзей.

Рэжысёр Аляксандр Анісімаў, для якога гэта першая гістарычная карціна, зазначае, што работа была няпростай. Амаль палова з 50 кіназмен праходзіла ўначы пры свечках, бо ўдзень у Лідскім, Мірскім, Нясвіжскім замках, дзе здымалі «лінію Радзівілаў», няспынна ішлі экскурсіі. Таксама адмыслова для фільма дэкаратары кінастудыі сабралі дакладна па схемах і чарцяжах Леанарда да Вінчы танк з паравым рухавіком — калісьці шведскія кінематаграфісты не змаглі сабраць гэтую канструкцыю, а беларусы не толькі ажыццявілі яе, але і прымусілі рухацца.

...На грым і пераадзяванне акцёраў патрабавалася каля чатырох гадзін, і на працу перад камерамі прыпадала зусім няшмат часу, таму ўсе службы пастаянна знаходзіліся напагатове, а персанажы загадзя ўваходзілі ў вобразы. Абраныя па выніках кастынгу акцёры — адзначым, выключна беларускія, і гэта прынцыпова важны момант — каб ужыцца ў эпоху, шмат займаліся сцэнічнымі баямі і верхавой яздой. І нават у ролях другога плану, падкрэсліваюць стваральнікі карціны, акцёры здолелі раскрыцца і стварыць сапраўдны цікавы ансамбль. «Калі ёсць добрая літаратурная аснова, у адрозненне ад многіх сучасных штампаваных серыялаў, калі нават за другасным персанажам адчуваецца глыбіня, лёс чалавека — вельмі цікава іграць гэтую ролю, і я ўдзячны аўтару і рэжысёру за магчымасць такой працы», — гаворыць **народны артыст Беларусі Аляксандр ТКАЧОНАК**, які ў «Авантурах» сыграў аптэкара Лейбу. «Працаваць над характарам свайго героя, які заўжды выступае за справядлівасць, ад чаго і пакутуе, нешта пра яго прыдумляць, эксперыментаваць — усё гэта было невераґодна цікава», — падтрымлівае калегу **Георгій ПЯТРЭНКА** — Пранціш Вырвіч.

Людміла Рублеўская выказала надзею, што ў фільме ўдалося перадаць галоўнае: дух эпохі і характар персанажаў, гатовых абараняць тэрыторыю ўнутранай свабоды са зброяй у руках. «Была ў нас задума зрабіць творчую масоўку, куды запісаліся многія мае сябры, дый я сама хацела зняцца ў некаторых масавых сцэнах — але бюджэт не дазваляў разагнацца на коней, карэты і масавыя сцэны, дый касцюмаў адпаведнай эпохі не хапала, таму ідэя, на жаль, не здзейснілася», — разводзіць рукамі пісьменніца. А вось над беларускамоўным агучваннем стужкі, якога чакае большасць гледачоў, праца вядзецца дагэтуль. І хочацца верыць, што вынік будзе станоўчым, і «кіно з нацыянальным характарам» атрымаецца такім не толькі ў рэлізах кінастудыі, але і на справе. Нагадаем, у пракат «Авантуры Пранціша Вырвіча» выйдуць з 19 сакавіка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Фэст

# «Казюкі» адкрываюць кірмашы

**«Казюкі» — свята ў гонар Святога Казіміра, ахоўніка рамёстваў і майстроў. Малады шляхціц з роду Ягелонаў у XVII стагоддзі быў прызнаны святым, і з тае пары ў яго гонар праводзяцца кірмашы рамеснікаў і народных майстроў. «Казюкі» — адзін з самых вядомых і маштабных кірмашоў у Літве і Польшчы. Дваццаць гадоў таму такое свята стала праходзіць і ў Гродне. Сёлета сюды прыехалі са сваім таварам рамеснікі Польшчы, Літвы, Расіі і Украіны — усяго 220 майстроў.**

Менавіта з гэтага дня пачынаўся сезон гандлю. Лічыцца, што наколькі ўдалы будзе першы вясенні кірмаш, настолькі і ўвесь год. Усе майстры гэта ведаюць і стараюцца прадставіць новыя эксклюзіўныя рэчы. Разам з асобнымі майстрамі свае вырабы паказалі раённыя дамы народнай творчасці. У гэтым шэрагу асабліва ўразіла Іўе, дзе існуе вельмі моцная школа саломапляцення. Новы кірунак работы цэнтра — фларыстычныя карціны. На іх існуе добры попыт, расказалі супрацоўнікі цэнтра. Невялікія разышліся за 5-6 рублёў, а ў беспройгрышнай латарэі можна было выйграць прыгожы саламяны вянок.

Велікодныя кошычкі з невялікіх тэкстыльных лялек-яек можна было набыць за 20—25 рублёў. Новы трэнд — штучныя кветкі ў вазах і гаршках. Некаторыя букеты, як, напрыклад, півоні і архідэі, выглядалі даволі рэалістычна. Цана адной такой кампазіцыі даходзіла да 50 рублёў.

Жанчыны цікавіліся вырабамі з валенай шэрсці. Выбраць сапраўды было з чаго: шалі, паланціны, шапкі, берэты і сумкі... Дарэчы, з'явіўся на кірмашы і новы трэнд — празрыстая шарсцяная накідка з вышытым арнаментам, цаной ад 30 да 40 рублёў. Выклікалі цікавасць і яркія валёнкі, для загараднага дома — вельмі зручны і цёплы абутак.



Фота БелТА.

Каля аднаго з павільёнаў на пляцоўцы размясціўся незвычайны аркестр: музыканты ў ім усе драўляныя, з бярозавых цурак, іграюць, седзячы на драўляных крэслах. Такія інсталяцыі прывёз майстар з Літвы, яны могуць упрыгожыць прысядзібны двор альбо дзіцячую пляцоўку. Цана іх — ад 35 да 60 рублёў.

А каб усім наведвальнікам пашчасціла, у цэнтры пляцоўкі арганізатары ўстанавілі вялікую падкову-вароты. Праходзячы праз яе, кожны мог загадаць жаданне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Пантэон Айчыны

# Юзаф Аляшкевіч (1777—1830)

**Мастака Юзафа Аляшкевіча сучаснікі лічылі старамодным і дзіўным чалавекам. «Адносіны да яго асоб, нават высокапастаўленых, былі такія, як вучняў да настаўніка-сябра. Апроч таго, яго амаль энцыклапедычная вучонасць, а галоўнае, рэдкія якасці душы і хрысціянская дабрачыннасць, асабліва пакорлівасць, якая не дапускала ў ім і цені ганарыстасці ад поспехаў, прыдбалі яму любоў і павагу ва ўсіх, хто знаў яго, — зазначалі сучаснікі.**



Сын беднага музыканта з Радашковіч, пазбаўлены сталай матэрыяльнай падтрымкі, Юзаф дасягнуў вяршынь мастацтва сваім талентам. Ён прыцягнуў увагу аматара мастацтва графа Аляксандра Хадкевіча, які замовіў Аляшкевічу вялікую кампазіцыю з алімпійскімі багамі. Палатно «Алімп» спадабалася графу, і з грашовай падтрымкі Хадкевіча Аляшкевіч у 1803—1806 гадах вучыўся ў Парыжы ў заснавальнікаў французскага класіцызму мастакоў Давіда Энгра і Жана Луі Давіда. Пасля вяртання з-за мяжы Юзаф Аляшкевіч жыў у графскім маёнтку Пекалава на Валыні і аказаўся ў становішчы прыдворнага мастака, вымушанага не толькі выконваць замовы свайго гаспадара-апекуна, але і дагаджаць ягонаму мастацкаму густу. Тады панавала эстэтыка класіцызму з яе антычнымі ідэаламі ўзвышанага і гераічнага. У Пекалаве Аляшкевіч напісаў 11 карцін у класічным стылі, самай вядомай з якіх стала карціна «Развітанне гетмана Хадкевіча з маладой жонкай перад адпраўленнем пад Хацін» (захоўваецца ў палацы-музеі Замойскіх у Казлоўцы). Гістарычнаму мінуламу Рэчы Паспалітай Аляшкевіч прысвяціў яшчэ адну карціну — «Абарона Церабоўлі», дзе паказаў гераізм абаронцаў ад туркаў у 1675 годзе.

Да эпічнага жанру Аляшкевіч вымушаны быў звяртацца дзеля кар'еры мастака. Так, у 1810 годзе за карціну «Смерць Клітамнестры» ён быў прыняты ў члены імператарскай Акадэміі мастацтваў, а за карціну «Дабрадзейнасць імператрыцы Марыі Фёдараўны» (знаходзіцца ў Дзяржаўным Рускім музеі) атрымаў у 1812 годзе званне акадэміка жывапісу ў Імператарскай Акадэміі мастацтва. Нават калі ўлічыць кан'юнктурнасць тэмы, дык усё роўна за Аляшкевіча сведчыў высокі мастацкі ўзровень.

Але прызнанне мастаку прынеслі ўсё ж партрэты, у якіх ён паказваў сутнасць і характар чалавека. На партрэтах Аляшкевіча шэраг гістарычных асоб — гэта і яго апякун Аляксандр Хадкевіч, славуты вучоны і асветнік Марцін Пачобут-Адляніцкі, дзяржаўны дзеяч Адам Чартарыйскі, рэктар Віленскага ўніверсітэта Геранім Страйноўскі, паэт Адам Міцкевіч, музыкант Аляксей Львоў, палкаводзец Міхаіл Кутузаў, кампазітар Міхаіл Клеафас Агінскі, князь Мікалай Радзівіл, граф Леон Сапега і іншыя.

Між іншым Юзаф Аляшкевіч вызначаўся не толькі мастацкім талентам. Яго містычныя разважанні слухалі зачаравана, як прамовы жраца. Увогуле Аляшкевіч вызначаўся сваімі прароцтвамі, — прадказаў паводку ў Пецярбургу, праліццё крыві на Сенатнай плошчы; за маральны аўтарытэт Аляшкевіча нават выбралі кіраўніком масонскай ложы «Белы арол». Высокае становішча не закружыла галаву мастаку: жыў ён сціпла, грошы, зробленыя пэндзлем, аддаваў беднякам і часта сам галадаў, у сардэчнай прастаце дараваў і ўладзеям, якія абкрадалі яго. Вядомы выпадак, калі ён яшчэ аддаў дзесяць рублёў злодзею — маўляў, чалавеку яны больш патрэбныя. Кранальны ягоны клопат пра бадзячых кошак і сабак на ўтрыманне якіх ён даваў грошы.

...Праводзілі Аляшкевіча ў апошні шлях і знаць, і беднякі, якія шчыра аплаквалі свайго дабрадзея. Ягоны біёграф Мараўскі трапна выказаўся: «Можна было яго ці менш, ці болей любіць, але немагчыма было не любіць яго... Здавалася, што апроч свайго паклікання і прысвячэння мастацтву гэты чалавек меў іншую місію. Але таксама ўсё мяне пераконвае, што адышоў ён ад нас неспазнаны з-за таго, што яго спазнаць былі не вартыя».

**Вітаўт ЧАРОПКА.**